# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ БЕЛАРУСКАГА АРНАМЕНТУ Ў СУЧАСНЫМ ДЫЗАЙНЕ АДЗЕННЯ

*К.А. Жбанкова*
*Віцебск, ДУА «Гімназія № 4 г. Віцебска»*

Мастацтва прыгожа і са смакам апранацца заўсёды было адметнай рысай нашых беларускіх суайчыннікаў. Беларуская мода – яркае, творчае з'яўленне, якое захоўвае свае каштоўнасці, нягледзячы на хуткую змену модных пераваг, яна не старэе, яе ўзоры мінулых дзесяцігоддзяў становяцца культавымі ўзорамі свайго часу, якія гавораць пра прыгажосць, эстэтыку, паўнавартасць жыцця не менш за літаратурныя, жывапісныя, кінематаграфічныя творы.

На мяжы XX–XXI стст зноў узрастае цікавасць да этнічнай культуры і іх творчай спадчыны, элементы этнадызайну пачынаюць выкарыстоўваць у дэкарыраванні прадметаў, якія функцыянальна не звязаны з традыцыйнай культурай, напрыклад, у дызайне моднага адзення ці ў сувенірнай прадукцыі.

У сучасным касцюме, зробленым у этнічным стылі, у залежнасці ад модных трэндаў выкарыстоўваюцца шматкампазіцыйныя арнаментальныя матывы. Традыцыйныя ўзоры ў модзе таму, што гэта адзін са спосабаў выказвання вернасці сваёй Бацькаўшчыне. Можна заўважыць, што моладзь стамілася быць грамадзянамі свету і ўсё часцей цікавіцца тым, што блізкае, сваё, традыцыйнае. Аднак праблеме выкарыстання традыцыйнага арнаменту ў сучасным адзенні не ўдзяляецца асаблівай ўвагі. Таму вывучэнне праблемы арнаментацыі сучаснага адзення актуальна і перспектыўна.

Мэта навуковага даследавання: выяўленне асаблівасцей узаемадзеяння сучаснага адзення і этнічнага арнаменту ў гістарычным і эстэтычным аспектах.

Для дасягнення мэты неабходна вырашыць наступныя задачы: даследаваць гісторыю развіцця беларускага арнаменту; адзначыць унікальнасць і незвычайнасць сімволікі беларускага арнаменту; вызначыць актуальнасць выкарыстання беларускага арнаменту ў сучасным дызайне адзення.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам працы паслужылі розныя віды беларускага арнаменту ў сучасным дызайне адзення. Вызначаная мэта і задачы патрабавалі выкарастання сукупнасці метадаў даследавання: тэарэтычныя (мадэліраванне, аналіз і сінтэз) і эмпірычныя (назіранне, параўнанне).

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Чалавек з даўніх часоў упрыгожвае арнаментамі розныя прадметы: посуд, прылады і зброю, тэкстыльныя вырабы, мэблю, кнігі, архітэктурныя збудаванні і г.д. Усё тое, што людзі бачаць, а майстры робяць сваімі рукамі, павінна адказваць не толькі свайму функцыянальнаму, утылітарнаму назначэнню, але і радаваць вока прыгажосцю. Акрамя чыста эстэтычнай функцыі арнамент традыцыйна нясе інфармацыю аб уладальніку, а раней выконваў і ролю талісмана, напрыклад, абярэга ад злых сіл. Таму пры стварэнні ўзораў у народным стылі неабходна ўлічваць сэнсавае значэнне іх асобных матываў.

Раскрыта таямніца іерогліфаў Егіпта, пісьмёнаў старажытных Асірыі, Вавілона, Кітая, Індыі. Гэткая ж таямніца – і ў арнаментыцы тканых і вышываных вырабаў беларускіх сялянак.

Мастацтва вышыўкі мае сваю гісторыю. Яно, як і любое другое мастацтва, ведала перыяды росквіту і ўпадку. Яе калыскай лічыцца Усход. Аб гэтым сведчаць вопратка і прадметы быта, якія захаваліся з далёкай старажытнасці. Вышыўка заўжды цесна звязана з гістрычнымі і культурнымі асаблівасцямі эпохі і розных перыядаў развіцця кожнага народа, у яе аснову пакладзены нацыянальныя матывы, каларыт і арнаменты. Прыёмы вышыўкі , узоры , іх каляровае ўвасабленне ўдасканальвалася з пакалення ў пакаленне. Паступова адбіралася ўсё лепшае і ствараліся непаўторныя ўзоры вышывак з характэрнымі нацыянальнымі рысамі.

Па характару ўзораў і прыёмаў іх выканання беларуская вышыўка вельмі разнастайная. Асобныя вобласці, а часам і раёны мелі свае характэрныя прыёмы, матывы арнаменту, каляровае рашэнне. Беларуская вышыўка мае свае нацыянальныя асаблівасці, яна адрозніваца ад вышывак іншых народаў.

На шчасце, захаваліся шматлікія ўзоры беларускай вышыўкі, і сёння яны для нас – невычэрпная крыніца народнай мудрасці і жыцёвага вопыту нашых продкаў. За стагоддзі развіцця традыцыйная арнаментыка сканцэнтравала багаты вопыт назірання людзей за прыродаю, жыццём , рознымі зразумелымі і незразумелымі для іх з'явамі. І гэты вопыт мы спрабуем сёння расшыфраваць ,а таксама скарыстаць у нашым сённяшнім жыцці.



Репозиторий ВГУ

Глыбокі сэнс закладзены ў быццам бы простыя ўзоры, якія можна чытаць, як кнігу, глядзець, як спектакль ці кіно. Кожны ўзор нясе ў сябе той ці іншы сэнс , выяўляе пэўную ідэю. Адны ўзоры сімвалізуюць памяць аб продках, другія выказваюць зварот да багоў заступнікаў, трэція ўвасабляюць прыродныя з'явы, чацвёртыя адлюстроўваюць пачуцці і надзеі чалавека.

"Трэба многа знаць, каб узор прачытаць," – так гучыць народная мудрасць.

Што ні ўзор – то сімвал. Сімвалы ўраджаю: Спарыш, Рай, Багач. Яны вучаць любіць Маці-Зямлю, працу, дабівацца добрага ўраджаю. Сімвалы святаў: Купала, Каляда, Масленіца, Вялікдзень. Тут- радасць, весялосць, гонар за вынікі сялянскай працы. Сімвалы памяці: Дзяды, Радаўніца- любоў і павага да продкаў. Усё, што захавана ў народнай вышыўцы, не пералічыць, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, праўду, кожны ўзор мае свае прызначэнне і сваю назву.

Лепшыя дасягненні нацыянальнай беларускай вышыўкі выкарыстоўваюцца і пераасэнсоўваюцца мадэльерамі, майстрамі народных мастацкіх промыслаў , застаюцца крыніцай творчага ўвасаблення , высокім узорам мастацтва.

Сучаснымі мадэльерамі вельмі часта выкарыстоўваецца ўзор сонца, які зрабіўся сімвалам шчасця і дабрабыту. Таксама вельмі часта сустракаецца сімвал дзіцяці, сям'і. Лічыцца, што гэтыя сімвалы аберагаюць ад няшчасцяў, з'яўляюцца абярэгам.

Нават дзяржаўныя сімвалы РБ заснаваны на традыцыях беларускай вышыўкі. За аснову арнаменту, размешчанага на белым фоне Дзяржаўнага сцяга РБ, пакладзены ўзор "Узыходзячае сонца." Асноўны элемент арнаменту – выцягнуты па вертыкалі ромб – гэта сімвал узыходзячага сонца і звязанай з ім урадлівасці зямлі. Дзве крыжападобныя перасечаныя лініі ў цэнтры ромба з чатырма кропкамі паміж імі сімвалізуюць засеянае поле.

**Заключэнне.** Такім чынам трэба адзначыць, што кожнаму чалавеку патрэбнае пачуццё прыналежнасці, адчуванне таго, кім ён ёсць і адкуль ягоныя карані. Мастацкая спадчына беларускіх народных прадметаў быту яркая і непаўторная. Гэта неад'емная частка духоўнай нацыі, якая дапамагае фарміраваць культурны воблік сучасніка, плённа паслужыць новым пакаленням.

Вышытыя рэчы – гэта нібы своеасаблівая эстафета ад старэйшых да малодшых, зашыфраваны наказ любіць бацькоў і зямлю, шанаваць продкаў, не цурацца працы. Гэта зарука жыццёвасці народа і нацыі.

Захапленне вышыўкаў садзейнічае развіццю густа, пачуцця прыгожага, творчых здольнасцей, расшырэнню кругагляду, выхаванню павагі да народных звычаяў і традыцый, а галоўнае – прыносіць ні з чым не параўноўваемую радасць творчасці і дастаўляе задаволенасць тым, хто бачыць вынік гэтай крапатлівай і цудоўнай працы.

Спіс літаратуры


1. Белинский В.Г. Эстетика и литературная критика. М., 1959,т.2.с.319
2. Бондарчык В.К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі.-Мн., 1972
3. Беларускае народнае адзенне / Пад рэд. А.А. Малчанава, П.М.Курыловіча і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1975
4. Беларусы. Т.5 Сям'я/ В.К.Бондарчык, Г.М.Курыловіч і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мн.: Бел. Навука, 2001
5. Жабінская М.П. Складзі ўзор сам: народны арнамент у побыце. Мн., 1992
6. Кацар М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка/ Навуковы рэд.Я.М.Сахута – Мн.: БелЭн,1996
7. Ліцьвінка В. Святы і абрады беларусаў. – Мн: Беларусь. – 1997
8. Раманюк М.Ф. Беларускае народнае адзенне. – Мн.: Беларусь, 1981
9. Фадзеева В.Я. Беларуская народная вышыўка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991
10. Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. Вучэбна-метадычны дапаможнік. – Мн.: Беларусь,1997
11. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн.: БелСЭ. -1990


## ФОРМООБРАЗОВАНИЕ И ПРОЕКЦИИ ПРОСТРАНСТВЕННЫХ ОБЪЕКТОВ НА ПЛОСКОСТИ ПРИ МАКЕТИРОВАНИИ ПРЕДМЕТНО-ПРОСТРАНСТВЕННОЙ СРЕДЫ ИНТЕРЬЕРА


*В.И. Коваленко*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Работа дизайнера связана с проектированием пространственных, трехмерных форм. Наиболее достоверным приемом конкретизации проектного замысла является точное воспроизведение идеи в макете, который дает возможность проверить безошибочность ожидаемого визуального впечатления, вызывает большее понимание проектной идеи и упрощает предметность его обсуждения.

Репозиторий ВГУ